ЗАЦВЯРДЖАЮ
Начальнік упраўлення культуры
Гродзенскага аблвыканкама
________ А.В.Клімовіч
________ 2024 г.

# ІНСТРУКЦЫЯ
аб парадку арганізацыі і правядзення абласнога фестывалю народнай творчасці “Крыніца жыцця”

1. Дадзеная Інструкцыя вызначае парадак арганізацыі і правядзення абласнога фестывалю народнай творчасці “Крыніца жыцця” (далей – Фестываль).
2. Фестываль праводзіцца з мэтай захавання і падтрымкі традыцыйнай нематэрыяльнай культурнай спадчыны, адраджэння, развіцця і папулярызацыі лепшых традыцый і дасягненняў нацыянальнай культуры.
3. Асноўныя задачы:
   выяўленне самабытных носьбітаў беларускага фальклору, захаванне іх творчасці, пашырэнне межаў іх дзейнасці;
   выяўленне мастацкіх творчых і індывідуальных выканаўцаў;
   далучэнне дзяцей, падлеткаў і моладзі да гісторыка-культурнай спадчыны сваёй краіны і прапаганда традыцыйнай народнай творчасці;
   павышэнне ўвагі да вывучэння мясцовых нацыянальных традыцый;
   павышэнне ўзроўню выканальніцкага майстэрства і сцэнічнай культуры аматарскіх калектываў;
   папулярызацыя лепшых узораў паэтычнага, музычнага і песеннага мастацтваў;
   перадача традыцыйнай культуры з пакалення ў пакаленне як неад’емнай часткі ўкладу жыцця чалавека.
4. Арганізатарамі Фестывалю з’яўляюцца: упраўленне культуры Гродзенскага аблвыканкама і ўстанова адукацыі “Гродзенскі дзяржаўны каледж мастацтваў”.
5. У рамках Фестывалю праводзіцца абласны конкурс нацыянальнага фальклору “Крыніца жыцця” (далей – Конкурс).
6. У Конкурсе могуць прымаць удзел навучэнцы і выпускнікі дзіцячых школ мастацтваў, сярэдніх школ, гімназій, удзельнікі музычных (творчых) студый пры ўстановах культуры, дзіцячых творчых калектываў вобласці і Рэспублікі Беларусь, а таксама прыватных вакальных студый (далей, калі не вызначана іншае, – удзельнікі конкурсу).
7. У 2024 годзе Конкурс **праводзіцца 20.04.2024** (заключны этап). Месцам правядзення заключнага этапу Конкурсу з’яуляецца канцэртная зала ўстановы адукацыі “Гродзенскі дзяржаўны каледж мастацтваў”.
8. Конкурс праводзіцца па намінацыях:

“Фальклорны ансамбль” (вакальны/вакальна-інструментальны);

“Ансамбль народных інструментаў” (малых формаў – до 4 чалавек, вялікіх формаў – ад 5 чалавек, аднастайныя і змешаныя);

“Індывідуальны выканаўца” (інструментальная музыка, сольныя спевы);

“Мастацкае чытанне”;

“Сцэнічнае абрадавае дзеянне”

9. Для ўдзельнікаў Конкурсу вызначаюцца тры ўзроставыя групы:

да 9 гадоў уключна (першая група);

ад 10 да 14 гадоў уключна (другая група);

ад 15 да 18 гадоў уключна (трэцяя група).

Пры змешаным складзе ўдзельнікаў узроставая група вызначаецца па сярэднім узросце.

Узрост удзельнікаў Конкурсу вызначаецца на дату яго правядзення

10. У фальклорным ансамблі, ансамблі народных інструментаў могуць прысутнічаць да 25% канцэртмайстраў, якія не залічваюцца ў лік удзельнікаў.

11.Патрабаванні да выканаўцаў:

у намінацыях “Фальклорны ансамбль (вакальны/вакальна-інструментальны), “Індывідуальны выканаўца (сольныя спевы)” - выкананне двух рознахарактарных твораў (песень) на беларускай мове працягласцю да 10 хвілін, у аснове якіх - нацыянальны фальклор, скіраваны на змястоўнае раскрыццё мастацкіх традыцыў сваёй мясцовасці;

у намінацыях “Ансамбль народных інструментаў”, “Індывідуальны выканаўца (інструментальная музыка)” мяркуецца выконваць на клавішных (баян/акардэон) і струнных (цымбалы, гітара, балалайка, домра) музычных інструментах двух рознахарактарных твораў, адзін з іх беларускага аўтара, працягласцю да 10 хвілін;

у намінацыі “Мастацкае чытанне” – выкананне аднаго закончанага твора або ўрыўка (проза, паэзія, сказ, байка) беларускага аўтара, працягласць выступлення не больш за 5 хвілін, магчыма музычнае афармленне нумара, рэквізіт, мінімальныя дэкарацыі;

у намінацыі “Сцэнічнае абрадавае дзеянне” – увасабленне фрагмента абрада, абрадавай гульні, тэатралізаванага рытуалу, працягласць выступлення да 10 хвілін. Магчыма выкарыстоўванне відэакантэнту.

12.Конкурс праводзіцца ў два туры:

I тур – адборачны – праводзіцца ўстановамі адукацыі або ўстановамі культуры.

II тур – заключны – праводзіцца ўпраўленнем культуры Гродзенскага аблвыканкама і ўстановай адукацыі “Гродзенскі дзяржаўны каледж мастацтваў” **20.04.2024** (г. Гродна, БЛК, 23).

13. Для кіраўніцтва падрыхтоўкай і правядзеннем конкурсу ствараецца арганізацыйны камітэт (далей - аргкамітэт). Кантактныя тэлефоны аргкамітэта конкурсу: 80152 56 58 53, 80152 55 34 39, +375 29 6096487.

14. Аргкамітэт:

ажыццяўляе непасрэднае кіраўніцтва падрыхтоўкай і правядзеннем конкурсу;

ажыццяўляе ўзаемадзеянне з зацікаўленымі суб'ектамі культурнай дзейнасці, іншымі арганізацыямі па пытаннях падрыхтоўкі, правядзення конкурсу і яго асвятлення ў сродках масавай інфармацыі;

вырашае іншыя пытанні, якія ўзнікаюць падчас падрыхтоўкі і правядзення конкурсу.

15. Для ўдзелу ў заключным этапе конкурсу не пазней **за 15.04.2024** мастацкім кіраўніком або ўдзельнікам конкурсу на электронную пошту art_college@artcollege.by высылаецца заяўка ў фармаце Word (дадатак 1) і скан квітанцыі аб аплаце.

16. Для ацэнкі выкананняў удзельнікаў заключнага этапу конкурсу ўпраўленнем культуры Гродзенскага абласнога выканаўчага камітэта зацвярджаецца склад журы конкурсу.

17. У склад журы заключнага этапу конкурсу ўваходзяць педагагічныя работнікі ўстаноў адукацыі ў сферы культуры Гродзенскай вобласці і Рэспублікі Беларусь, творчыя работнікі, дзеячы культуры і мастацтва, прадстаўнікі ўпраўлення культуры Гродзенскага аблвыканкама.

18. Журы:

ацэньвае выкананне ўдзельнікамі Конкурсу твораў;

афармляе пратаколы вынікаў выкананняў удзельнікамі конкурсу;

вызначае пераможцаў конкурсу ў кожнай намінацыі;

інфармуе ўдзельнікаў конкурсу аб выніках іх удзелу ў конкурсе;

разглядае звароты ўдзельнікаў конкурсу па выніках ацэнкі выкананняў.

19.Пры падвядзенні вынікаў журы карыстаецца наступнымі крытэрыямі:

валоданне рэгіянальнай манерай выканання;

захаванне мясцовага рэпертуару і мастацкага стылю;

узровень выканальніцкага майстэрства (чысціня строю, манера гукавымаўлення, тэхніка ігры на музычных інструментах, выразнасць);

узровень складанасці выкананых твораў;

артыстызм і эмацыянальнасць выканання;

адпаведнасць фальклорнага рэпертуару ўзросту выканаўцаў;

наяўнасць этнічных строяў;

сцэнічная культура ўдзельнікаў, культура нашэння касцюма.

20. У ходзе выступленняў удзельнікаў у заключным туры журы вызначае пераможцаў конкурсу ў кожнай намінацыі і ўзроставай катэгорыі і ўзнагароджвае дыпломамі гран-пры, I, II, III ступені, дыпломамі ўдзельнікаў і памятнымі прызамі.

Журы мае права не прысвойваць месцы, падзяляць 2, 3 месцы, уводзіць новыя ці аб'ядноўваць намінацыі ў межах выдзеленага прызавога фонду.

21. Рашэнне аб удзеле ў конкурсе азначае згоду выканаўцы і накіроўваючых яго бакоў на фота-, відэа- і аўдыёздымку яго выступу.

Арганізатары конкурсу пакідаюць за сабой права на размяшчэнне матэрыялаў Конкурсу ў СМІ і сетцы «Інтэрнэт».

22. Фінансаванне выдаткаў па арганізацыі і правядзенні заключнага этапу конкурсу ажыццяўляецца за кошт сродкаў удзельнікаў, пералічаных за ўдзел у конкурсе ў памеры 35 руб. – “Індывідуальны выканаўца”, “Мастацкае чытанне”, 50 руб. - “Фальклорны ансамбль”, “Ансамбль народных інструментаў”, “Сцэнічнае абрадавае дзеянне”, іншых крыніц, не забароненых заканадаўствам Рэспублікі Беларусь. Банкаўскія рэквізіты: BY74 AKBB 3632 0000 0068 0400 0000 (пазабюджэт), ГОУ № 400 ААТ «АБ Беларусбанк», БІК AKBBBY2X, ОКПО 02071760, УНП 500024001. У квітанцыі неабходна ўказаць прозвішча ўдзельніка і мэту плацяжу – удзел у конкурсе “Крыніца жыцця”.

23. Сума ўзносу ўдзельніка ўключае выдаткі:

на статутную дзейнасць кампаніі арганізатара;

на матэрыяльна-тэхнічнае забеспячэнне;

выраб дыпломаў, сувенірнай прадукцыі;

адміністрацыйныя выдаткі;

гаспадарчыя і камунальныя выдаткі;

расходныя матэрыялы;

правядзенне рэкламнай кампаніі.

24. У выпадку няяўкі ўдзельніка на конкурс сродкі, пералічаныя за ўдзел, не вяртаюцца.

25. Фінансаванне выдаткаў па праезду і харчаванні ўдзельнікаў ажыццяўляецца за кошт накіроўваючага боку.

Дадатак 1
да інструкцыі аб парадку арганізацыі і правядзення абласнога фестывалю народнай творчасці "Крыніца жыцця"

# ЗАЯЎКА
на ўдзел у абласным конкурсе нацыянальнага фальклору
"Крыніца жыцця"

1. Найменне ўстановы ______________________________________
______________________________________________________
2. Назва калектыву_________________________________________
______________________________________________________
3. Прозвішча, імя, імя па бацьку выканаўцы ці ўдзельнікаў з датай нараджэння:
1________________________________________________
2________________________________________________
3________________________________________________
4________________________________________________
5________________________________________________
6________________________________________________
______________________________________________________
______________________________________________________
______________________________________________________
4. Намінацыя, узроставая катэгорыя ____________________________
______________________________________________________
5. Прозвішча, імя, імя па бацьку педагога (кіраўніка), e-mail, нумар тэлефона
______________________________________________________
______________________________________________________
6. Праграма, хранаметраж:
1.________________________________________________
______________________________________________________
2.________________________________________________
______________________________________________________
7. Тэхнічныя патрабаванні, неабходныя для выступу _______________
______________________________________________________
______________________________________________________
______________________________________________________
______________________________________________________
______________________________________________________